**А. Пузан**

# СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ДЗЕЯСЛОВА *ЖЫЦЬ* У БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Усебаковае даследаванне словаўтваральных гнёздаў (далей СГ) дазваляе прасачыць асноўныя асаблівасці ўтварэння новых слоў, выявіць спецыфічныя словаўтваральныя афіксы, прааналізаваць структуру словаўтваральнай парадыгмы кожнага ўтваральнага, вылучыць найбольш характэрныя словаўтваральныя тыпы і дапоўніць СГ лексемамі, якія на сённяшні момант не фіксуюцца нарматыўнымі слоўнікамі.

Матэрыялам даследавання паслужылі 235 лексем, засведчаных як ў нарматыўных слоўніках сучаснай беларускай літаратурнай мовы, так і не адлюстраваныя ў іх, але якія функцыянуюць у розных стылях беларускай мовы: навуковым, гутарковым, стылі мастацкай літаратуры.

Са структуры СГ бачна, што ступені словаўтварэння адрозніваюцца прадуктыўнасцю. На I ступені знаходзіцца 28 дэрыватаў. Наибольшая колькасць вытворных размяшчаецца на II ступені – 93 вытворныя. Прадуктыўнасць словаўтварэння змяншаецца з кожнай новай ступенню: на III ступені ўтворана 73 дэрываты, на IV – 22, зусім малаколькаснымі з’яўляюцца ўтварэнні V (13) і VI (5) ступеняў.

Спосабы ўтварэння і іх прадуктыўнасць у межах кожнай ступені неаднолькавыя. У гняздзе рэалізаваны як марфалагічныя, так і немарфалагічныя спосабы словаўтварэння. Самым прадуктыўным спосабам на I ступені з’яўляецца прыставачны, што адлюстроўвае граматычныя заканамернасці дзеяслоўнага словаўтварэння беларускай мовы (*пра-жыць, вы-жыць, да-жыць*). У колькасных адносінах дамінуюць суфіксальныя вытворныя (*жыв-асць, жыв-ец, жыв-а, жыв-ёл-а*).

Кампазітныя вытворныя: *жывёл-а-гадоўл-я, жыва-глот, жывёла-нарыхтоўк-а, доўга-жыхар, жыцц-е-забеспячэнне, жыцц-е-ўстойлів-ы*, *жыцц-я-дзейн-ы*, *жыл-плошча*). Ёсць у СГ і рэпрэзентанты канверсі (*аджыл-ае*).

Такім чынам, СГ дзеяслова *жыць* можна кваліфікаваць як моцаразгорнутае, комплекснае, веерна-ланцужковае. Праведзены аналіз пацвярджае палажэнне аб тым, што дэрывацыйны патэнцыял дзеяслоўнага СГ дэтэрмінуецца стылістычнай маркіраванасцю/немаркіраванасцю слова-вяршыні, аб’ёмам яго семантычнай структуры, спалучальнасцю і ідыяматычнымі сувязямі.